всеобщей истории раннего Нового времени, подготовки специалистов, способных оперировать как отечественным историческим материалом, так и массивом информации европейской (в том числе российской) истории.

Наконец, нужно помнить и о том, что современная Беларусь – это самостоятельное государство, находящееся в центре Европы. В раннее Новое время Великое Княжество Литовское и Речь Посполитая часто находились в центре сплетений европейской политической и дипломатической истории. Учитывая это обстоятельство, просто необходим выход за рамки непосредственно отечественной истории и создание собственной школы европейских исследований раннего Нового времени.


1. *Кручковский, Т. Т.* Польская проблематика в творчестве Н. И. Кареева / Т. Т. Кручковский, А. Н. Нечухрин // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: новыя канцэпцыі і падыходы : матэрыялы ўсебеларуская канферэнцыя гісторыкаў, Мінск, 3–5 лютага 1993; у 2 ч. – Мінск, 1995. – Ч. 2. – С. 116–123.

2. *Кручковский, Т. Т.* Проблемы разделов Речи Посполитой в русской историографии второй половины XIX – начала XX века / Т. Т. Кручковский // Славяноведение. – 1993. – № 5. – С. 76–85.

3. *Ляховіч, Л. У.* Сацыяльна-палітычнае развіцце Рэчы Паспалітай ва ўмовах еўрапейскага абсалютызму (канцэпцыя М. І. Карэева) / Л. У. Ляховіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2010. – Вып. 25. – С. 25–29.

4. *Полосин, И. И.* Споры об «опричнине» на польских сеймах XVI века (1569–1582) / И. И. Полосин // Социально-политическая история России XVI – начала XVII вв. / Акад. наук СССР, Ин-т истории. – М., 1963. – С. 157–181.



***К. А. Лапотка,*** *аспірант*


## ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У КУЛЬТУРЫ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Кожны народ шануе і захоўвае сваю культурную спадчыну, якая з’яўляецца скарбам, і ў той самы час стварае аснову для самаідэнтыфікацыі нацыі. Спадчына выконвае значную ролю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўнай асновы і самабытнасці той ці іншай культуры, падкрэслівае яе разнастайнасць і адрозненне ад іншых культур.

За доўгую гісторыю беларускі народ назапасіў вялікую кольскасць аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, матэрыяльнай і нематэрыяльнай, захаванню якіх надаецца шмат увагі. Працэсы, якія тычацца пытанняў захавання і трансляцыі інфармацыі аб абъектах спадчыны, рэгулююцца заканадаўча.

Не апошнюю ролю адыгрываюць канкрэтныя праекты, якія прысвечаны пэўнай тэматыцы, асобе ці аб'екту. На сучасным этапе развіцця грамадства і сферы культуры ажыццяўленне праектаў становіцца асобным накірункам дзейнасці са сваімі асаблівасцямі: скіраванасць на дасягненне мэтаў і вынікаў, унікальнасць, сувязь са зменамі, каардынаванае выкананне дзеянняў, абмежаванасць у часе, дасягненне пэўных вынікаў і эфектыўнасць. Усё больш суб'ектаў культуры звяртаюцца да выкарыстання праектных механізмаў у сваёй дзейнасці, што тлумачыцца іх рэальнымі перавагамі на практыцы.

Час, у які мы зараз жывем, адзначаецца ўладай інфармацыі і разнастайных сродкаў яе перадачы. З гэтага вынікае, што амаль любая дзейнасць звязана з распаўсюджваннем інфармацыі пра яе вынікі. Гэта прывяло да таго, што кожны праект зараз мае абавязковыя дзеянні па яго прасоўванню ў СМІ і у прасторы Інтэрнэт. Для праектаў ствараюцца асобныя сайты, старонкі ў сацыяльных сетках, распаўсюджваецца інфармацыя ў газетах, часопісах, на радыё, тэлебачанні і г. д. У час панавання інфармацыі гэта вельмі важна, таму што дае магчымасць хутка даставіць інфармацыю не толькі да мэтавай группы, але і да значна больш шырокага кола аўдыторыі, якая таксама можа быць у гэтым зацікаўлена.

У Беларусі ўжо шмат зроблена шмат ў галіне захавання культурнай спадчыны, але яшчэ больш трэба зрабіць. Дзейнасць не прыпыняецца. Зыходзячы з эфектыўнасці ажыццяўлення і актыўнага распаўсюджвання інфармацыі, мы прапануем разглядаць праектную дзейнасць у сферы культуры як сродак захавання і папулярызацыі культурнай спадчыны.

Праекты прыцягваюць увагу грамадства да пэўных пытанняў і праблем захавання культурнай спадчыны. Як вынік – шырокай аўдыторыі вядома, што адбываецца ў гэтай галіне, якія існуюць цяжкасці, і адкрываюцца магчымасці для непасрэднага ўдзелу ў гэтай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З кожным годам колькасць праектаў павялічваецца так хутка, што не ўсе з іх магчыма адсачыць. Тым не менш, маюцца канкрэтныя прыклады буйных праектаў, якія адбыліся ці працягваюць ажыццяўляцца. Для прыкладу мы ўзялі некалькі такіх праектаў, розных па маштабах і храналогіі. Нашай мэтай было паказаць, у якасці ілюстрацыі, што яна актыўна ажыццяўляецца.

Першы праект у нашым спісе – «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», які пачаўся ў 2013 г., а заканчэнне плануецца ў 2017. Гэта мнагатомнае факсімільнае выданне, якое дазволіць сабраць поўны рэпертуар кніг, надрукаваных Францыскам Скарынай у Празе і Вільне. У яго аснову пакладзены электронныя копіі кніг першадрукара, якія найбольш захаваліся і знаходзяцца ў музеях і бібліятэках розных краін. Усе выданні суправаджаюцца каментарыямі навукоўцаў, а таксама перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны на сучасную беларускую, рускую і англійскую мовы. Праект рэалізуецца напярэдадні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры падтрымцы банка БелВЭБ. Нажаль, пакуль яшчэ няма агульнага інфармацыйнага рэсурса ў Інтэрнэце, дзе была б сабрана ўся асноўная інфармацыя пра гэты праект. Тым не менш, шмат інфармацыі прадстаўлена ў інтэрнэт-выданнях, на тэлебачанні, газетах і часопісах, на радыё, інтэрнэт-прataле НББ (Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) і г. д.

Цікавы праект, прысвечаны кніжнай культуры Беларусі – «Кніга Беларусі XIV–XVIII стагоддзяў», утрымлівае копіі поўных тэкстаў дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выданых у XIV–XVIII ст. і па тэрытарыяльных, моўных, аўтарскіх ці змястоўных прыкметах адносяцца да Беларусі.

Гэты праект пастаянна развіваецца. У перспектыве ў яго будуць уключаны копіі дакументаў з фондаў іншых бібліятэк, у тым ліку замежных, з тым, каб дадзены рэсурс у поўным аб'ёме прадставіў кніжную спадчыну Беларусі ў сусветнай інфармацыйнай прасторы [1]. Доступ к праекту можна атрымаць анлайн з інфармацыйнага партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Адрас сайта праекта: http://belbook.nlb.by/. Выканаўца праекта – Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Яшчэ адзін выбітны прыклад – праект «Арт-Беларусь» [2]. Са слоў старшыні праўлення ААТ «Белгазпромбанк» Віктара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бабарыкі, размешчаных на партале праекта, «Праект “Арт-Беларусь”, які вырас з карпаратыўнай калекцыі ААТ “Белгазпрамбанк”, набыў статус праекта нацыянальнага маштабу, які прызваны паказаць гістарычны зрэз выяўленчага мастацтва Беларусі ва ўсёй паўнаце і цэласнасці. Сёння “Арт-Беларусь” здольна служыць аднаўленню сувязяў з культурна-гістарычнай спадчынай мінулага і надаць новы імпульс развіцця сучаснаму беларускаму мастацтву» [4]. Гэты праект працягвае сваё існаванне і прадстаўлены ў прасторы Інтэрнэт пасродкам партала artbelarus.by.

Наступны праект, на які мы звярнулі ўвагу, прысвечаны нематэрыяльнай культурнай спадчыне Беларусі. Гэта – Жывая Спадчына Беларусі. Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны [5]. Гэты сайт – «спецыялізаваны рэсур Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, які ўтрымлівае інфармацыю пра лепшыя здабыткі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. … Сайт створаны пры фінансавай і кансультатыўнай падтрымцы Фонда нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА» [3].

Зыходзячы з прыведеных намі прыкладаў, можна зрабіць выснову, што ў Беларусі вядзецца актыўная праектная дзейнасць. Вялікая колькасць суб’ектаў культуры ўцягнуты ў ажыццяўленне гэтай дзейнасці, ў стварэнне і распаўсюджванне інфармацыі пра пэўныя праекты ці аб’екты. Мы прывялі толькі некалькі прыкладаў, якія палічылі дастаткова яркімі. Але іх ў дзясяткі разоў больш.Такім чынам, мы лічым, што апасродкавана праектная дзейнасць і пэўныя праекты, прысвечаны тэматыцы культурнай спадчыны, з’яўляюцца эфектыўнымі сродкамі захавання і папулярызацыі гэтай спадчыны праз прыцягненне ўвагі грамадства да пытанняў захавання і вырашэння канкрэтных праблем, якія тычацца культурнай спадчыны Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Аб праекце // Кніга Беларусі XIV–XVIII стагоддзяў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belbook.nlb.by/about. – Дата доступу : 14.10.2016.

*2.* Арт-Беларусь [Электронны рэсурс] // Арт-Беларусь. Нацыянальны гісторыка-культуралагічны праект. – Рэжым доступу : http://artbelarus.by/be/. – Дата доступу : 15.10.2016.

*3.* Жывая спадчына Беларусі [Электронны рэсурс] // Жывая Спадчына Беларусі. Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. – Рэжым доступу : http://livingheritage.by/. – Дата доступу : 14.10.2016.

*4.* Канцэпцыя [Электронны рэсурс] // Арт-Беларусь. Нацыянальны гісторыка-культуралагічны праект. – Рэжым доступу : http://artbelarus.by/be/about.html. – Дата доступу : 15.10.2016.

5. Пра праект [Электронны рэсурс] // Жывая Спадчына Беларусі. Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. – Рэжым доступу : http:// livingheritage.by/about/. – Дата доступу : 14.10.2016.

***В. Е. Леончиков,***
*доктор педагогических наук, профессор,*
*профессор кафедры теории и истории*
*информационно-документных коммуникаций*

# МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ВОПРОСЫ КЛАССИФИКАЦИИ ИНФОРМАЦИОННЫХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ РЕСУРСОВ

Процесс классификации информационных образовательных ресурсов включает две фазы. На первой строится ее методологический фундамент: выявляется сущность образовательных информационных ресурсов, разрабатываются принципы построения и функционирования, определяются логические требования при классификации объектов, раскрываются основания (признаки) классификации и другие атрибуты информационных ресурсов.

Под образовательными информационными ресурсами (далее – ОИР) мы будем понимать документ или совокупность документов, содержащих знания, самостоятельно оформленных и предназначенных для распространения среди неограниченного круга лиц и служащих основой для предоставления информационных услуг. Ключевым признаком ОИР является предназначение их для распространения среди неопределенного круга лиц, для которых они представляют интерес, т. е. имеют потребительскую ценность.

Другая обязательная черта – обеспечение доступа к информационным ресурсам, сведениям, которые включены в каталог, т. е. предоставление за плату или безвозмездно неограниченному кругу лиц. Доступ к информационным ресурсам может

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ